# ПІЛЬНАЯ АКЦЫЯ

## ЖУДАСНЫ СТАН ЗДАРОЎЯ ЗНЯВОЛЕНАЙ ПРАВААБАРОНЦЫ

**Наста Лойка, беларуская праваабаронца, вязынка сумлення і адукатарка, павінна быць неадкладна вызваленая. Яна адбывае сямігадовы турэмны тэрмін, вынесены паводле сфабрыкаваных абвінавачванняў у "распальванні расавай, нацыянальнай, рэлігійнай ці іншай сацыяльнай варожасці і варажнечы", каб пакараць за яе праваабарончую дзейнасць. Паведамляецца, што ў зняволенні яна падлягае катаванням і іншым відам жорсткага абыходжання. Яна не атрымлівае ежы, якая забяспечвала б адэкватнае харчаванне, што згубна ўплывае на яе здароўе. Яна на шэсць месяцаў пераводзілі ў памяшканне камернага тыпу на працяглае адзіночнае зняволенне, што з'яўляецца катаваннем або іншым відам жорсткага, бесчалавечнага або прыніжальнага годнасць абыходжання або пакарання.**

### ДЗЕЙНІЧАЙЦЕ: НАПІШЫЦЕ ЗВАРОТ СВАІМІ СЛОВАМІ АБО СКАРЫСТАЙЦЕСЯ ГЭТЫМ УЗОРАМ ЛІСТА

***Дзмітры Гара***
*Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь*
*вул. Інтэрнацыянальная, 22*
*Мінск 220030*
*Рэспубліка Беларусь*
*Электронная пошта: info@prokuratura.gov.by*

*Паважаны Сп. Генеральны пракурор,*

*Выказваю глыбокую занепакоенасць адвольным зняволеннем вязня сумлення, праваабаронцы і адукатаркі Насты (Настассі) Лойкі ў гомельскай выпраўленчай калоніі. Сямігадовае зняволенне - гэта помста за яе праваабарончую працу і крытыку ўладаў Беларусі.*

*Яна ўтрымлівалася ва ўмовах жорсткага абыходжання, у тым ліку падлягала працягламу адзінокаму зняволенню на працягу шасці месяцаў у памяшканні камернага тыпу плошчай чатыры квадратныя метры з забаронай прыёму пасылак, якія мелі вырашальнае значэнне для яе правільнага харчавання і здароўя, а таксама забаронай званкоў і спатканняў. На дадзены момант ёй дазваляюцца толькі лісты і адзін званок на месяц ад яе 78-гадовай маці. За два гады і чатыры месяцы зняволення ёй дазволілі толькі адно спатканне з маці. Яе беспадстаўна дадалі да спісу "тэрарыстаў", што перашкаджае ёй атрымліваць грашовую дапамогу ў турме і, такім чынам, яна не можа дазволіць сабе належным чынам харчавацца. Наста - веганка, і ёй даводзіцца купляць веганскую ежу ў турэмнай краме, каб правільна харчавацца, але грошай на гэта няма. Гэта згубна ўплывае на яе фізічнае і псіхічнае здароўе.*

***Настойліва заклікаю вас:***

***• Забяспечыць неадкладнае і безумоўнае вызваленне Насты Лойкі і спыніць злоўжыванні сістэмай крымінальнага правасуддзя, скіраваныя супраць яе і іншых праваабаронцаў у Беларусі.***

***• Забяспечыць хуткае, незалежнае і эфектыўнае расследаванне інфармацыі пра катаванні і іншыя віды жорсткага абыходжання ў дачыненні да Насты Лойка, а таксама справы пра яе адвольнае зняволенне і пераслед, і прыцягнуць да адказнасці ў рамках справядлівага судовага разбору падазраваных і адказных за супрацьпраўныя дзеянні.***

*З павагай,*

# ДАДАТКОВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

Наста Лойка была адвольна затрыманая 6 верасня 2022 года, калі яна пакідала Мінскі гарадскі суд пасля ўдзелу ў судовым пасяджэнні ў працэсе супраць калег-праваабаронцаў Марфы Рабковай, Андрэя Чапюка і васьмі іншых абвінавачаных. 7 верасня 2022 года Насце Лойцы прысудзілі 15 сутак арышту за нібыта "дробнае хуліганства", парушэнне артыкулу 19.1 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэннях. 22 верасня 2022 года суд Фрунзенскага раёну Мінска прызначыў ёй дадатковае 15-дзённае зняволенне па гэтым жа артыкуле. Падчас зняволення Наста Лойка была пазбаўленая доступу да адваката і ёй было адмоўлена ў неабходным медыцынскім лячэнні і прадметах першай неабходнасці, у тым ліку цёплай вопратцы і пітной вадзе. Яе вызвалілі 6 кастрычніка 2022 года пасля адбыцця арышту.

28 кастрычніка 2022 года Насту Лойку зноў адвольна затрымалі ў Мінску, а 31 кастрычніка 2022 года далі яшчэ 15-дзённы арышт на падставе тых жа абвінавачванняў. Пасля адбыцця 15-дзённага зняволення Наста Лойка не выйшла на волю 12 лістапада 2022 года, і супраць яе зноў выставілі тыя ж самыя абвінавачванні. Падчас судовага разгляду анлайн Наста Лойка паведаміла, што падчас допыту яе катавалі электрычным шокерам і што яе пакінулі на восем гадзін у двары пры халодным паветры без цёплай вопраткі. У выніку яна захварэла. Турэмныя ўлады адмаўляліся перадаваць Насце Лойцы перадачы з лекамі, сродкамі асабістай гігіены і цёплай вопраткай, якія ёй былі тэрмінова неабходнымі.

24 снежня 2022 года, пасля пяці 15-дзённых тэрмінаў утрымання пад вартай, супраць Насты Лойкі былі выстаўленыя крымінальныя абвінавачванні: паводле артыкулу 342.1 ("Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх") і артыкулу 130.3 ("распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай ці іншай сацыяльнай варожасці або варажнечы"). Падставай для апошняга абвінавачвання стала меркаваны ўдзел Насты ў напісанні праваздачы аб пераследзе анархісцкай супольнасці ў Беларусі за 2018 год. У дакладзе даецца крытычная ацэнка дзейнасці супрацоўнікаў міліцыі, якую следчыя кваліфікавалі як "распальванне варожасці" ў дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі як "прафесійнай групы" - абвінавачванне ў "экстрэмізме". Гэта яшчэ адзін прыклад адкрытай крыміналізацыі праваабарончай дзейнасці з боку ўладаў Беларусі.

20 чэрвеня 2023 года Насту прызналі вінаватай і прысудзілі да сямі гадоў пазбаўлення волі. 3 кастрычніка 2023 года разгляд апеляцыйнай скаргі на такі вырак. Прысуд быў пакінуты ў сіле. У лістападзе 2023 года Насту перавялі з Мінскага СІЗА ў Гомельскую турэмную калонію, дзе яна цяпер адбывае прысуд. Акрамя таго, 12 кастрычніка 2023 года Камітэт дзяржаўнай бяспекі (КДБ) уключыў Насту ў "Спіс арганізацыяў і фізічных асобаў датычных да тэрарыстычнай дзейнасці" – цяпер любыя фінансавыя аперацыі з яе ўдзелам забароненыя, а людзям, якія збіраюць сродкі для яе падтрымкі, можа пагражаць абвінавачванне ў "фінансаванні тэрарыстычнай дзейнасці".

У жніўні 2025 года Насту перавялі ў камеру плошчай чатыры квадратныя метры. Яна правяла там шэсць месяцаў у поўнай ізаляцыі да канца студзеня 2026 года.

У канцы студзеня 2026 года Насту перавялі на агульныя ўмовы ў калонію. Яна пачала працаваць на швейнай фабрыцы, як і большасць іншых зняволеных у гомельскай калоніі. Зняволеныя працуюць не менш за восем гадзін на дзень і атрымліваюць 5-10 еўра на месяц.

Першы адвакат Насты сутыкнулася з рэпрэсіямі з боку дзяржавы за тое, што прадстаўляла яе, і была вымушаная ў выгнанне. Яе другую адвакатку, каб адпомсціць, пазбавілі адвакацкай ліцэнзіі. Гэта было відавочным парушэннем права Насты на справядлівы судовы разбор, у тым ліку права быць прадстаўленай адвакатам на свой выбар.

Больш за 1200 чалавек, зняволеных па палітычна матываваных справах, усё яшчэ знаходзяцца за кратамі ў Беларусі. У іх шэрагах - праваабаронцы "Вясны" Марфа Рабкова, Валянцін Стэфановіч і валанцёр Віталь Чопік.

**ПАЖАДАНАЯ МОВА ДЛЯ ЛІСТА ДА АДРАСАТА:** беларуская, руская, англійская
Вы таксама можаце пісаць на сваёй мове.

**ПРОСІМ НЕАДКЛАДНАГА ДЗЕЯННЯ САМАЕ ПОЗНЯЕ ДА:** 02.09.2026

Звяртайцеся ў бюро Amnesty international ў вашай краіне, калі вы хочаце адправіць зварот пасля заканчэння пазначанага тэрміну.

**Імя і займеннік:** Наста (Настасся) Лойка (яна/яе)

**Спасылка на папярэднюю пільную акцыю:** **Беларусь: Дадатковая інфармацыя: Праваабаронцы прад'яўленыя крымінальныя абвінавачванні: Наста Лойка - Amnesty International**